**Бараноўскі А.В.**

# УСПАМІНЫ МАРЫІ СВЯЦКАЙ ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ Ў аг. ПОЛЫМЯ СЕННЕНСКАГА РАЁНА

*Ключавыя словы: Сенненскі раён, Полымя, Беліца, Марыя Свяцкая, Карл Свяцкі, сядзіба Свяцкіх, успаміны Марыі Свяцкай.*

У 2024 г. у Варшаве пабачылі свет успаміны Марыі Свяцкай – жонкі апошняга ўладальніка маёнтка Беліца (цяпер аг. Полымя Сенненскага раёна) Карла Свяцкага. Успаміны былі падрыхтаваны да публікацыі Томашам Лашкевічам, прафесарам Інстытута гісторыі імя Тадэвуша Мантойфля Польскай акадэміі навук. Польскі гісторык правёў сур’ёзнае даследаванне, у выніку якога былі выяўлены разрозненыя рукапісы ўспамінаў Марыі Свяцкай. На сённяшні дзень дакладна вядомы і ўведзены ў навуковы зварот Т. Лашкевічам рукапісы, што захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы, Універсітэцкай бібліятэцы ў Торуні, Навуковай бібліятэцы Польскай акадэміі мастацтва і Польскай акадэміі навук. Распаўсюджваннем і папулярызацыяй успамінаў Свяцкай у свой час займалася яе нявестка Барбара з Кажанёўскіх.

Пры напісанні артыкула мы карысталіся надрукаванымі ўспамінамі Марыі Свяцкай. Выданне мае мяккую вокладку і агульны загаловак «Wspomnienia z lat 1872–1924» («Успаміны 1872–1924 гг.»). Кніга складаецца з уводзін, яны ж утрымліваюць заўвагі рэдактара. Асноўная частка падзелена на пяць сшыткаў (brulion). Першы – «1872–1894 Перыпетыі жыцця Марыі Свяцкай. Успаміны дзяцінства і юнацтва». Другі – «1894–1896 [На Беларусі]», Трэці – «1894–1914 Шлюб 1894 г.». Чацвёрты – «1914–1918 Гісторыя адной з сядзіб на Беларусі ў гады вайны і рэвалюцыі 1914 г. – 1918 г.». Пяты – «1894–1924. Грамадская праца Марыі Свяцкай». У выданні прадстаўлены тры дадаткі: «Нататка Марыі Свяцкай – не знойдзена ў рукапісах – цытуецца ў кароткім машынапісе ўспамінаў, падрыхтаваным Барбарай Свяцкай з Кажанёўскіх, нявесткай аўтара ўспамінаў», «Нататка Марыі Свяцкай на пачатку невялікага (на шасці старонках) незавершанага рукапісу адной з версій яе ўспамінаў. Яе змест – у адрозненне ад астатніх фрагментаў гэтага рукапісу – не паўтараўся ў больш шырокай версіі пад назвай “Перыпетыі жыцця Марыі Свяцкай. Успаміны дзяцінства і юнацтва”», «Ліст Марыі Свяцкай да сына Станіслава Свяцкага, напісаны з Прыстані (в. Архідыяконка Хелмжскага павета), 13.10.1924 г.». Выданне ўзбагачаюць імянны і геаграфічны паказальнікі, падрадковыя тлумачэнні і ўдакладненні, а таксама здымкі з сямейнага альбома [3].

У дадзеным артыкуле будуць прааналізаваны ўспаміны, што тычацца беліцкага перыяду жыцця Марыі Свяцкай. Усебаковы аналіз працы для айчыннай гістарыяграфіі яшчэ наперадзе. На сённяшні дзень існуюць дзве грунтоўныя працы, у якіх прыводзіцца гісторыя сядзібна-паркавага комплексу Свяцкіх у Полымі (Беліцы) [1; 2]. У сувязі з гэтым засяродзім увагу толькі на новых фактах, якія ўдакладняюць і дапаўняюць гістарыяграфічныя звесткі. Хоць крыніцы апавядальнага характару вызначаюцца даволі суб’ектыўным падыходам аўтараў да разглядаемых пытанняў, тым не менш яны з’яўляюцца вельмі цікавымі і каштоўнымі, бо ўтрымліваюць фактычны матэрыял, які не трапіў на старонкі архіўных дакументаў і перыядычнага друку. У нашым выпадку так і ёсць.

З уводзін мы даведаемся, што аўтар успамінаў – Марыя Свяцкая нарадзілася 6 снежня 1872 г. у Лысаміцах пад Торунню. Там прайшлі яе дзяцінства і ранняе юнацтва, што знайшло адлюстраванне ў асобным раздзеле ўспамінаў. Яе бацька Эдуард Данімірскі (1844–1907) – удзельнік паўстання за аднаўленне незалежнасці Рэчы

Паспалітай (1863–1864). Маці Хелена з Валяньскіх (1850–1931) атрымала музычную адукацыю ў Дрэздэнскай кансерваторыі [3, с. 8].

Атрымаўшы базавую хатнюю адукацыю, трынаццацігадовая Марыя Свяцкая прыцягнула навучанне ў школе пры манастыры Найсвяцейшага Сэрца (Sacré Coeur) у Львове [3, с. 46]. Пасля чатырох гадоў навучання аўтар успамінаў вярнулася на радзіму.

Шлюб Марыі не быў дамовай бацькоў, яна сапраўды кахала свайго мужа. Падчас палявання ў паморскіх лясах Марыя пазнаёмілася са сваім будучым мужам Карлам Свяцкім (1866–1929), уладальнікам беліцкай сядзібы. У Лысаміцах Свяцкі быў вядомай асобай, яго старэйшая сястра, таксама Марыя, пабралася шлюбам з Людвікам Сляскім (далёкім родзічам Данімірскіх), сужэнцы жылі у суседнім Тшэбчу Шляхецкім [3, с. 53]. Пасля вяселля ў 1894 г. Карл і Марыя Свяцкія пакінулі Прусію і паехалі на сталае месца жыхарства ў маёнтак Беліца Сенненскага павета Магілёўскай губерні [3, с. 8–10]. Тут нарадзіўся іх адзіны сын – Станіслаў (1895–1974). Ён быў ахрышчаны 7 мая 1895 г. у Сенненскім касцёле. Хроснымі немаўляці сталі Філіп Дваржэцкі-Багдановіч і Антаніна Славінская [3, с. 72].

Свяцкія жылі ў мураваным з цэглы сядзібным доме. Паводле ўспамінаў, у двухпавярховай сярэдняй частцы дома размяшчаўся хол, за ім – бальная зала са шклянымі дзвярыма, якія вялі на драўляную тэрасу і ў парк. З левага боку ад бальнай залы знаходзіўся будуар гаспадыні дома, з правага боку – сталовая. Са сталовай можна было трапіць у кабінет Карла Свяцкага і яго прыёмную. На першым і другім паверхах размяшчаліся пакоі для гасцей і прыслугі, а таксама гардэробныя. У падвале была вялікая кухня, прасторная камора і склеп з вінам і старкай [3, с. 64–65]. У 1905 г. варшаўскі інжынер Стэфан Гладах распрацаваў для сядзібнага дома сістэму водазабеспячэння і водаадводу. У ванных пакоях былі ўсталяваны фарфоравыя ракавіны і ванны, прывезеныя з Дрэздэна. Дзякуючы ўстаноўцы бойлера ў доме была заўсёды гарачая вада [3, с. 80].

Жыхары сядзібы былі цалкам забяспечаны прадуктамі харчавання. У Беліцы пяклі тры віды хлеба, булачкі і пірагі. Летам варылі варэнне, рабілі шмат сокаў, кампотаў. Штогод нарыхтоўвалі свініну і ялавічыну. Мяса салілі ў вялікіх бочках, у далейшым вэндзілі ядлоўцавым і яловым дымам. У лядоўні захоўваліся бочкі з салёным маслам для кухонных патрэб. Воцат таксама рыхтавалі дома ў вінных бочках [3, с. 67].

Паводле ўспамінаў Марыі Свяцкай, мясцовыя жыхары – сяляне і рабочыя не атрымлівалі медыцынскай дапамогі. Ёй прыйшлося наладзіць гэтую справу. Спачатку з Сянно кожны тыдзень прыязджаў лекар, потым у Беліцы Свяцкія заснавалі амбулаторыю і нанялі фельчара [3, с. 78].

У пачатку ХХ ст. Марыя Свяцкая актыўна ўдзельнічала ў працы польскага Таварыства асветы і дабрачыннасці ў Магілёве, а таксама была старшынёй яго філіяла ў Сянне. У 1905–1917 гг. у Беліцы дзейнічаў прытулак для бяздомных сірот. Прытулак размяшчаўся ў адным з дапаможных будынкаў каля сядзібы. Каля прытулку была зроблена дзіцячая пляцоўка. Дзеці з маленства прывучаліся да працы. Хлопчыкі пераймалі веды і ўменні ад садоўніка, слесара, цесляра, электрыка, малочніка і конюха. Дзяўчынкі ў сваю чаргу – ад пакаёўкі, кухара, прачкі і служанкі [3, с. 80–82].

Пасля пачатку Першай сусветнай вайны Свяцкія ператварылі сядзібны дом і шматлікія гаспадарчыя пабудовы ў часовае жыллё. Яны ўдзельнічалі ў арганізацыі збору грошай і рэчаў для польскіх ваеннапалонных і бежанцаў, якія аказаліся ў нястачы. Падзеі 1914–1918 гг. знайшлі найбольш поўнае адлюстраванне ва ўспамінах Марыі Свяцкай у параўнанні з папярэднімі гадамі.

Знаходжанне ў Беліцы падчас вайны Марыі Гурэцкай – дачкі паэта і публіцыста Адама Міцкевіча, а таксама Тэадора Дыдынскага – польскага юрыста і прафесара Варшаўскага эканамічнага ўніверсітэта з’яўляецца вядомым фактам, аднак дзякуючы

падрадковым тлумачэнням выдання, мы даведваемся, што Карл Свяцкі па мацярынскай лініі быў родзічам мужа Марыі Гурэцкай. У сваю чаргу жонка Тэадора Дыдынскага з'яўлялася сястрой маці Марыі Свяцкай [3, с. 92–93]. Дзякуючы ўспамінам Марыі Свяцкай, стала вядома, што менавіта ў Беліцы Стэфан Кяджынскі – польскі драматург і раманіст напісаў свой раман «W promieniu uczuć» [3, с. 104].

Вясной 1916 г. па маёнтку пракаціўся лёгкі голад. У сувязі з павальным запаленнем лёгкіх племянная буйная рагатая жывёла была выразана. З 200 кароў засталося толькі дзве, якія забяспечвалі жыхароў маёнтка малаком [3, с. 118–119].

Пачынаючы з мая 1917 г. у беліцкім парку адбываліся агітацыйныя сходы сялян і рабочых. Марыя Свяцкая згадвае, што мясцовыя сяляне спачатку насцярожана ставіліся да пачутых прамоў, але ў далейшым іх «ахапіла радасная вера ў ажыццяўленне абяцанага ім раю, і нарэшце пачуццё ўласнай сілы і з пагардай адносіцца да ўсякага аўтарытэту, духоўнай і слалоўнай перавагі» [3, с. 125]. Неўзабаве быў створаны Беліцкі працоўны камітэт. Свяцкія пралабіравалі ўключэнне ў яго склад свайго садоўніка Дарасевіча (адпрацаваў у іх 11 гадоў), аканома Маеўскага (адпрацаваў у іх больш за 50 гадоў), і повара (нядаўна прынятага на працу). Паводле ўспамінаў, повар адразу пранікся рэвалюцыйнымі ідэямі і Свяцкія яго звольнілі. Маеўскі пасля першых пасяджэнняў сам пакінуў камітэт. Дарасевіч жа не толькі пранікся рэвалюцыйнымі ідэямі, а ўзначаліў камітэт і ад яго імя стаў кіраваць маёнткам Свяцкіх [3, с. 126].

Рабочы камітэт забраў усе запасы хлеба і харчавання. Кожны дзень Карл Свяцкі і члены яго сям'і атрымлівалі неабходныя прадукты па картках. Пэўныя прадукты яны набывалі ў сялян з навакольных вёсак. Марыя Свяцкая ўспамінае, што сяляне не жадалі прадаваць памешчыкам прадукты, а калі прадавалі, то па вельмі вялікім кошце.

З лістапада 1917 па сакавік 1918 г. Свяцкія жылі ў Мінску. Пасля акупацыі Беліцы нямецкімі войскамі яны вярнуліся ў свой маёнтак. Сядзібны дом быў пераўтвораны ў казарму. Гаспадарам выдзелілі толькі 6 пакояў і асобны ўваход з вежы. У кароўніку знаходзілася некалькі дзясяткаў кароў. У свірне засталося крыху аўса і ячменю. Свяцкія пачалі наладжваць сваё жыццё [3, с. 142]. З мая па чэрвень 1918 г. яны жылі ў Мінску.

12 верасня 1918 г. было падпісана пагадненне руска-германскай камісіі аб парадку вываду германскіх войск з тэрыторыі Лепельскага і Сенненскага паветаў. 15 верасня 1918 г. Карл і Марыя Свяцкія ў суправаджэнні нямецкіх салдат назаўсёды пакінулі Беліцу. Астатнюю частку верасня і кастрычнік яны пражылі ў другім сваім маёнтку Крупка (цяпер цэнтр раёна ў Мінскай вобласці) [3, с. 146–148].

У канцы кастрычніка 1918 г. Свяцкія ў суправаджэнні атрада польскіх легіянераў адбылі ў Польшчу. Яны страцілі нерухомасць, каштоўнасці і грашовыя сродкі, якія захоўваліся ў банках. Пры гэтым ім удалося вывезці з Сенненшчыны сямнаццаць вагонаў рухомай маёмасці (гэта каштавала 31 000 марак) і прадаць значную частку жывога і мёртвага інвентару [3, с. 147].

Свяцкія атрымалі падтрымку сваіх родзічаў з Памераніі (там жылі найбліжэйшыя сваякі абодвух сужэнцаў). З верасня 1919 г. Марыя Свяцкая жыла ў Варшаве і працавала ў Камітэце абароны Усходніх крэсаў [3, с. 159]. Вясной 1920 г. яна вярнулася ў Памеранію. Там выкладала гісторыю і польскую мову ў сельскіх школах, працавала ў Паморскім таварыстве апекі над дзецьмі.

Як склаўся далейшы лёс уладальнікаў сядзібы ў Беліцы, можна даведацца з уступу да ўспамінаў. Карл Свяцкі, пераехаўшы ў Польшчу і з'яўляючыся паўнамоцным прадстаўніком Нацыянальнай рады беларускіх зямель, безвынікова спрабаваў дамагчыся ўключэння ўсёй Беларусі ў склад Польскай рэспублікі. У далейшым ён быў першым дырэктарам Паморскага сельскагаспадарчага таварыства і віцэ-прэзідэнтам гуртка сельскіх гаспадароў у Хелмжы. Станіслаў Свяцкі па рэкамендацыі торуньскага

старасты Адама Чарлінскага быў уладкаваны ва ўпраўленне Паморскага ваяводства ў Торуні [3, с. 15–16].

Свяцкія паступова распрадавалі прадметы з беліцкага збору, што мелі гістарычную або мастацкую каштоўнасць. Напрыклад, у 1925 г. яны прадалі карціну Валенція Ваньковіча «Партрэт Напалеона, які назірае за пажарам Масквы» і іншыя рэчы [3, с. 16].

Карл Свяцкі памёр 6 мая 1929 г., яго жонка – 29 снежня 1954 г., іх адзіны сын – у 1974 г., так і не пакінуўшы нашчадкаў [3, с. 17–18].

Такім чынам, успаміны Марыі Свяцкай значна ўдакладняюць і дапаўняюць гістарыяграфічныя звесткі. Ва ўспамінах прысутнічае апісанне сядзібы і паўсядзённага жыцця яе жыхароў. Расказваецца пра грамадскую працу Свяцкіх. Вельмі падрабязна прадстаўлена жыццё ў Беліцы ў 1914–1918 гг. Пры гэтым трэба адзначыць, што па-за ўвагаю Марыі Свяцкай засталася сямейная гісторыя яго мужа. Невядома, адкуль паходзіў род Свяцкіх, калі і ў каго яны набылі маёнтак Беліца. Ва ўспамінах, на жаль, адсутнічае апісанне маёнтка Беліца, яго наваколля і жыхароў. Неабходна таксама заўважыць, што Свяцкія пазіцыянавалі сябе палякамі і каталікамі і былі настроены патрыятычна. З'яўляліся яны і тыповымі прадстаўнікамі дваранскага саслоўя.


1. Бараноўскі, А. В. Полымя (Беліца): гісторыя маёнтка і вёскі / А. В. Бараноўскі. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2015. – 40 с.

2. Хмяльніцкая, Л. Маёнтак Беліца роду Свяцкіх / Л. Хмяльніцкая // Віцебскі сшытак : гістарычны навукова-папулярны альманах / рэд. Л. Хмяльніцкая. – Мінск : НББ, 2017. – Вып. 5. – С. 56–91.

3. Maria z Donimirskich Świacka. Wspomnienia z lat 1872–1924 / oprac. i wstępem opatrzył T. Łaszkiewicz. – Warszawa : Instytut Historii PAN, 2024. – 183 str.



**Соловьянов А.П.**


## ОПУБЛИКОВАННЫЕ ИСТОЧНИКИ ПО ИСТОРИИ СТАНОВЛЕНИЯ СИСТЕМЫ СОЦИАЛЬНОГО ОБЕСПЕЧЕНИЯ НАСЕЛЕНИЯ СОВЕТСКОЙ БЕЛАРУСИ


*Ключевые слова: опубликованные источники, социальное обеспечение, отчеты, защита, помощь.*


Система социального обеспечения населения в Советской Беларуси прошла сложный путь становления, развития и трансформации. Ее история отражает основные этапы формирования социальной политики СССР. На данную тему опубликовано много документов.

Опубликованные источники по становлению социальной защиты населения Советской Беларуси в межвоенный период можно условно подразделить на правовые источники, отчеты местных органов власти и различных организаций, материалы делопроизводства, работы высших партийных и советских руководителей, статистические источники, периодическую печать.

Прежде всего, следует рассмотреть правовые источники (законодательные и нормативные акты, циркуляры, декреты, постановления, распоряжения), поскольку данные документы позволяют выявить основные направления деятельности государства по защите населения. Из опубликованных материалов данной группы в первую очередь нужно назвать «Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства БССР», «Декреты Советской власти», «КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК», «Собрание узаконений и распоряжений рабочего и крестьянского правительства (с 1925 по 1938 г. «Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства РСФСР»), «Собрание законов и